


**Сёння ў нумары «звяздоўскі» насценны каляндар**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СЕРАДА №1 (28617)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# РАЗАМ МЫ ЗМОЖАМ МНОГАЕ

## Навагодні зварот Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа



Фота БЕЛТА.

Дарагія сябры!

Непрыкметна, але ўпэўнена і немінуча надыходзіць Новы, 2018 год. У гэтыя хвіліны асабліва адчувальна, які мімалётны час.

Так, галоўная адметнасць нашага часу — яго імклівы бег. Ісці крокам сёння раўназначна спыненню, стаяць — гэта адступаць назад. Мы пастаянна некуды спяшаемся, многае абавязаны паспець, каб наперадзе замаячыў той самы, жаданы вынік.

Зрэшты, і ў бурным патоку гэтага жыцця прытармазіць часам усё ж неабходна — хоць на імгненне — каб убачыць, ацаніць, падумаць аб важным і сказаць добрыя словы.

Перадначавагодняя хвіліны — менавіта такое імгненне. Цяпер, калі да бою гадзінніка застаецца зусім няшмат часу, успамінаем галоўнае, думаем пра будучыню.

У адыходзячым годзе намі прыняты рашучыя меры па ўдасканаленні эканомікі, што немінуча прывядзе да змянення нашага грамадства. Мы рызыкнулі зазірнуць за гарызонт, паставілі перад краінай мэты заўтрашняга дня. Дасягнуць іх — справа многіх гадоў!

У сувязі з гэтым мой зварот да моладзі: дзейнічайце, стварайце! Для вас адкрыты ўсе дзверы! Вы абавязаны ўзяць гэту неймаверна цяжкую вышыню. За вамі будучае краіны!

А вам, старэйшаму пакаленню, думаць пра спакой не атрымаецца. Вы нам патрэбны асабліва цяпер. Патрэбны вашы вопыт, веды, мудрасць. Менавіта вы павінны дапамагчы маладым у працэсе складанага руху наперад, уберагчы іх ад неабгрунтаванага імкнення зрабіць усё за імгненне, небяспекі адарвацца ад рэальнага жыцця і змарнаваць час.

Цяпер дарагі кожны дзень для стваральнай працы. Наперадзе ў нас шмат важных спраў ва ўсіх сферах жыцця краіны.

І будучы год — пярэдадзень вялікіх спартыўных падзей міжнароднага маштабу. Да нас прыедуць тысячы гасцей. І як сапраўдныя гаспадары беларускай зямлі мы аб'яднаемся і прывядзём наш агульны дом у належны парадак.

СТАР. 2

# Святочная «эстафета»

Кіроўца сталічнага ААТ «Мапід» Юрый ШУХНО са сваімі сынамі Мацвеем і Мікітам у першы вечар новага 2018 года прыйшоў святкаваць на Кастрычніцкую плошчу Мінска. Фотарэпартаж аб тым, як святкавалі мінчане і госці горада Новы год, глядзіце на сайце zviazda.by



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X
18001

# РАЗАМ МЫ ЗМОЖАМ МНОГАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь заўсёды славілася чысцінёй, добраўпарадкаванасцю гарадоў і вёсак, гасціннасцю людзей. Але цяпер нам трэба перасягнуць саміх сябе. Трэба зрабіць краіну ўзорнай. Каб кожны госць надоўга захаваў у душы цёплыя ўспаміны аб ёй. Каб мы маглі яшчэ больш ганарыцца сваёй Радзімай — дагледжанай, утульнай для жыцця, дружалюбнай і паважанай у свеце.

Менавіта за такую краіну — свабодную, незалежную — нашы продкі змагаліся, каб мы, хто жыве на гэтай зямлі, былі тут сапраўднымі гаспадарамі.

Пераемнасць, павага да заслуг кожнага чалавека, роўнасць і справядлівасць — асноўныя прынцыпы нашай дзяржавы.

Беларусь — краіна, накіраваная ў будучыню! Аснова нашага развіцця — высокія тэхналогіі, навука. Гэта так! Але заўсёды будзе запатрабавана праца рабочага і селяніна. Дзякуючы іх старанням мы сёння за багатым святочным сталом.

Дарагія сябры!

Галоўным здабыткам беларускай зямлі былі і застаюцца людзі. За ўсімі дасягненнямі стаіце менавіта вы — разумныя, таленавітыя, мэтанакіраваныя.

Тыя, хто штодзень змагаецца за жыццё і здароўе кожнага свайго пацыента.

Хто стаіць на варце закона і парадку, ахоўвае граніцы, забяспечвае абарону і бяспеку нашай краіны, займае дзяржаўныя пасады.

Хто працуе ў шахтах і заводскіх цэхах, на будаўнічых пляцоўках і ў сельскай гаспадарцы.

Хто гадуе і выхоўвае дзяцей, паспяхова перадае веды школьнікам і студэнтам, развівае навуку.

Хто сваёй творчасцю або спартыўнымі поспехамі праслаўляе Радзіму.

Асобныя віншаванні тым, хто сустракае Новы год не за сямейным сталом, а на рабочым месцы. Няхай гэта ноч будзе для вас спакойнай і святочнай.

Дарагія сябры!

Праз лічаныя секунды мы адкрыем новую главу свайго жыцця. Пакуль усе яе 365 старонак чыстыя. А што будзе ўпісана ў нашу гісторыю — залежыць ад кожнага з нас.

Ад усёй душы я жадаю, каб надыходзячы год стаў мірным, паспяховым і шчаслівым.

Будзьце шчодрыя на пачуцці, дарыце сваім родным і блізкім самае дарагое — цеплыню сэрцаў, увагу і клопат. І няхай вашы дамы напоўняцца святлом любові і дабра!

Шчасця вам, дарагія сябры!

З Новым годам, Беларусь!

# Рост ВУП і экспарту

**У апошні дзень мінулага года Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб задачах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2018 год».**

Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы грунтуюцца на прыярытэтах Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. Асноўнымі мэтамі 2018 года з'яўляюцца павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі, забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту і стварэнне дадатковых умоў для яго паскарэння ў наступныя гады.

Указам устанаўліваецца пералік найважнейшых параметраў, якія з'яўляюцца ключавымі паказчыкамі эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка.

Прагназуецца, што валавы ўнутраны прадукт у 2018 годзе вырасце на 3,5%, экспарт тавараў і паслуг — на 5,7%. Практычна нулявы знешнегандлёвы баланс гарантуе стабільнасць рэсурснага забеспячэння эканомікі ва ўмовах чакаемых выплат па знешнім доўгу і фарміраванне залатавалютных рэзерваў дзяржавы.

Нацыянальнаму банку і ўраду Прэзідэнт даручыў прыняць неабходныя меры, каб рост цэн у 2018 годзе не перавысіў 6%.

Пры падпісанні ўказа кіраўніком дзяржавы пастаўленыя ключавыя задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця. У тым ліку аб збалансаванасці плацежнага балансу, далейшай краінавай і таварнай дыверсіфікацыі.

Ураду даручана забяспечыць далейшы эканамічна абгрунтаваны рост заробку ў краіне на аснове стварэння перш за ўсё высокапрадукцыйных працоўных месцаў.

У 2018 годзе павінна быць скарочана міжрэгіянальная дыферэнцыяцыя ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва. Паскорыцца работа па паляпшэнні эканамічнай сістэмы краіны ў мэтах забеспячэння доўгатэрміновых крыніц эканамічнага росту, стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, нарошчвання экспартнага патэнцыялу. Як працяг работы па стымуляванні дзелавой і інвестыцыйнай актыўнасці будзе фарміравацца сістэма гарантый для інвестараў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пасля заявы КНДР аб гатоўнасці да дыялогу Паўднёвая Карэя прапанавала перамовы

На наступны дзень пасля заявы Пхеньяна аб магчымасці перамоў з Паўднёвай Карэяй Сеул прапанаваў правесці сустрэчу ўжо ў найбліжэйшыя дні. Кансультацыі на высокім узроўні маглі б прайсці 9 студзеня ў вёсцы Пханмунджом, якая знаходзіцца на мяжы дзвюх дзяржаў, заявіў у аўторак, 2 студзеня, паўднёвакарэйскі міністр аб'яднання.

Між тым прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін адзначыў, што паляпшэнне адносін паміж краінамі непарыўна звязана з вырашэннем праблемы вакол ядзернай праграмы КНДР. Таму МЗС у Сеуле павінна дэталёва ўзгадняць свае дзеянні «з саюзнікамі і міжнароднай супольнасцю», падкрэсліў ён. Адначасова прэзідэнт даручыў міністэрству аб'яднання і спорту прыняць тэрміновыя меры для забеспячэння ўдзелу паўночнакарэйскай дэлегацыі ў Алімпійскіх гульнях, якія пройдуць у лютым у паўднёвакарэйскім Пхёнчхане. Калі Гульні пройдуць паспяхова ў плане арганізацыі, гэта «будзе садзейнічаць дасягненню міру не толькі на Карэйскім паўвостраве, але таксама ў рэгіёне ў цэлым і ва ўсім свеце», гаворыцца ў заяве прэзідэнцкай адміністрацыі.

### У ходзе пратэстаў у Іране загінула больш за 20 чалавек



Колькасць ахвяр масавых пратэстаў у Іране расце. У ноч на 2 студзеня падчас масавых дэманстрацый у краіне загінулі дзевяць чалавек, у тым ліку вартавыя ісламскай рэвалюцыі. Як паведаміла іранская дзяржаўная тэлекампанія IPIБ, член Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі быў застрэлены ў ноч на аўторак, 2 студзеня, дэманстрантамі ў Неджэфабадзе ў цэнтральнай частцы краіны.

Акрамя таго, загінуў адзін паліцэйскі, адзін выпадковы прахожы і шэсць дэманстрантаў. Такім чынам, агульная колькасць ахвяр перавысіла 20 чалавек. Між тым, паводле афіцыйных звестак, за тры апошнія дні ў іранскай сталіцы былі затрыманы 450 чалавек.

Напярэдадні вечарам вярхоўны прадстаўнік ЕС па пытаннях знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі Федэрыка Магерыні заклікала Тэгеран гарантаваць грамадзянам «права на мірныя дэманстрацыі і свабоду выказвання меркавання».

Прэзідэнт Ірана Хасан Раўхані напярэдадні заявіў, што да антыўрадавых дэманстрацый у Іране прывяло ўмяшальніцтва трэціх краін, у першую чаргу Саудаўскай Аравіі. На думку кіраўніка дзяржавы, «ворагі Ісламскай Рэспублікі раззлаваныя поспехамі і прагрэсам іранскай нацыі і далі зарок наклікаць на Іран рэгіянальныя праблемы».

Адначасова ён прызнаў існаванне «недахопаў» у палітычнай сістэме краіны. Было б памылкай сцвярджаць, што пратэсты з'яўляюцца толькі следствам замежнай змовы супраць Ірана, заявіў ён падчас крызіснага пасяджэння меджліса.

### Кот сышоў з дому 10 гадоў таму. Але пажары ў Каліфорніі дапамаглі яму вярнуцца



У 2004 годзе амерыканка Джэні Томпсан, якая жыве ў каліфарнійскім горадзе Санта-Роза, узяла да сябе дадому кацяня. Гаспадыня чыпіравала Пілота (так назвалі жывёлу) і купіла ашыйнік, каб гадаванец мог гуляць па вуліцы самастойна. Але аднойчы кот адправіўся на двор і не вярнуўся, піша газета Daily Mail.

І вось праз дзесяць гадоў жанчыне патэлефанавалі і сказалі, што яе гадаванец жывы, праўда, не зусім здаровы. Хтосьці знайшоў небараку, які блукаў сярод папялішчаў пасля каліфарнійскіх лясных пажараў і занёс у зааклініку, дзе ветэрынары па чыпе выйшлі на яго гаспадыню. Джэні прыляцела са штата Каларада, дзе цяпер жыве, каб забраць Пілота назад.

Кот моцна абпаліў лапы і прахадзіў з апёкамі два тыдні. Але ён пазнаў сваю старую гаспадыню. Штодзённыя перавязкі, абязбольвальныя і лекі каштавалі вельмі дорага, таму Джэні запусціла краўдфандынгавую кампанію. Яна хацела сабраць для лячэння ката 3 тысячы долараў, але карыстальнікі ўжо сабралі ўдвая большую суму.

Праз два тыдні Пілот вярнуўся ў сям'ю Томпсанаў, дзе сустрэўся з дачкой Джэні. Ёй было восем гадоў, калі кот пайшоў з дому.

■ Блізкая ўлада

# Кіты, якія трымаюць рэгіён

**У Гродзенскай вобласці вызначыліся з прыярытэтамі і рыхтуюцца да мадэрнізацыі сяла. Уладзімір КРАЎЦОЎ адказаў на пытанні журналістаў падчас выніковай прэс-канферэнцыі.**



Фота БЕЛТА.

### Інвестыцыі: ад АЭС да беконнай свініны

Самым значным праектам не толькі рэгіёна, але ўсёй краіны, з'яўляецца будаўніцтва Беларускай АЭС у Астраўцы, адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама. Год, які наступіў, у многім тут вызначальны: работы будуць весціся па мантажы, каб падрыхтаваць да пуску ў 2019 годзе першы энергаблок.

Другім па важнасці аб'ектам Уладзімір Краўцоў назваў рэканструкцыю ўчасткаў трасы М-6 «Гродна — Мінск» і да граніцы з Польшчай. Асноўная частка сродкаў, якія выдзеліў Сусветны банк, засвоена. Сёлета работы плануецца завяршыць, каб падрыхтаваць магістраль да II Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

Значныя сродкі ўкладваюцца ў флагманы эканомікі — ААТ «Гродна Азот» і Лідскую «Лакафарбу», што дазволіць знізіць сабекошт прадукцыі і павялічыць экспарт. Дарэчы, гэты паказчык у вобласці мае станоўчую дынаміку. У 2018 годзе працягнецца работа па вызначэнні заказчыка і крыніцы фінансавання новага азотнага завода. На яго будаўніцтва патрэбен 1 млрд долараў.

Хуткімі тэмпамі развіваюць свой вытворчы патэнцыял параўнальна новыя прадпрыемствы. Сярод значных праектаў з удзелам замежных інвестыцый можна назваць вытворчасць мяса індычкі і дацкай беконнай свініны, лагістычны цэнтр у пункце пропуску Брузгі, завод медпрэпаратаў у Скідзелі, замежнае прадпрыемства «Кронаспан» у Смаргоні і іншыя.

### Аграрны сектар: рэкорды і спадзяванні

Нават у леташні «мокры» сезон на Гродзеншчыне атрымалі высокі, а па некаторых пазіцыях — рэкордны, ураджай. Гэта звязана з высокай тэхналагічнай дысцыплінай, упэўнены Уладзімір Краўцоў. Там, дзе ўсе нормы вытрымліваюцца, і надвор'е не надта ўплывае на вынік. Да 100 ц/га атрымалі збожжа ў СВК «Прагрэс-Верцялішкі», 1000 ц/га цукровых буракоў — у гаспадарцы «Свіслач» Гродзенскага раёна. Атрыманы рэкордны ўраджай рапсу і бульбы. І хоць многія паказчыкі самыя высокія па краіне, у вобласці ёсць патэнцыял, каб павысіць сярэднюю ўраджайнасць у паўтара раза, паведаміў кіраўнік рэгіёна.

Гэта датычыцца і жывёлагадоўлі. На Гродзеншчыне распрацавана праграма па мадэрнізацыі комплексаў і вываду з абароту старых, нерэнтабельных фермаў. Робіцца акцэнт на птушкагадоўлю. Гэтыя меры дазволілі значна знізіць колькасць стратных гаспадарак і вырашыць праблемы з выплатай зарплаты. Каб рухацца ў гэтым кірунку, патрэбны больш радыкальныя меры, лічыць гродзенскі губернатар. Ёсць спадзяванні, што ў гэтым дапаможа ўказ кіраўніка дзяржавы па мадэрнізацыі сяла, дзе будуць прапісаны і механізмы рэарганізацыі стратных гаспадарак.

### Навука: эфект для эканомікі

Свет імкліва рухаецца наперад, і мы не павінны адставаць, сказаў журналістам Уладзімір Краўцоў. Важная роля ў гэтым належыць навуцы. На Гродзеншчыне робяць акцэнт на ўніверсітэцкую і прыкладную навуку. У даследаваннях задзейнічана больш за 300 чалавек, асноўнай крыніцай фінансавання з'яўляецца бюджэт.

Многія праекты накіраваны на распрацоўку новых прамысловых тэхналогій. Такім чынам з'явілася вытворчасць па вырошчванні нелінейна-аптычных крышталяў на заводзе «Оптык», занальны інстытут раслінаводства рэалізуе праект па тэхналогіі вырошчвання бульбы. Цікавую распрацоўку ўкаранілі навукоўцы аграрнага ўніверсітэта ў ДНК-лабараторыі. Пакуль гэта адзіны ў краіне профіль па геномным аналізе жывёл, які акрэдытаваны ў краінах ЕС. Праект прыносіць фінансавую аддачу.

Каля паловы аб'ёму экспарту камп'ютарных паслуг прыходзіцца на рэзідэнтаў рэгіянальнага Парка высокіх тэхналогій, філіял якога створаны ў Гродне. Яшчэ адзін парк, але ўжо тэхналагічны, павінен садзейнічаць развіццю прадпрымальніцтва ў навуковай, інавацыйнай сферы. Бізнес-інкубатар будзе аказваць падтрымку маладым вучоным як у распрацоўцы новых тэхналогій, так і ў іх рэалізацыі. У 2018 годзе Парк атрымае свой корпус, паабяцаў Уладзімір Краўцоў.

### Рэаліі і планы сацыялкі

Бюджэт рэгіёна захоўвае сацыяльную накіраванасць. Больш за 70% расходаў прыпадае на гэтую сферу. Асобная ўвага ўдзяляецца мадэрнізацыі школ і будаўніцтву дзіцячых садкоў. Яшчэ 20 гадоў таму дашкольныя ўстановы зачыняліся з-за нізкай загрузкі; цяпер сітуацыя змянілася. Забудова новых мікрараёнаў патрабуе інфраструктуры. І яна ствараецца, зазначыў Уладзімір Краўцоў. У 2017 годзе здадзена амбулаторыя ў Гальшанах, паліклініка на 650 наведванняў у Гродне, будуецца бальніца ў Астраўцы. Пакуль не вырашылася пытанне па анкацэнтры — ідзе пошук крыніц фінансавання.

Павінны завяршыць будаўніцтва абласной філармоніі. Прыгожы будынак некалькі гадоў прастойвае з-за недахопу сродкаў. Уладзімір Краўцоў паабяцаў, што ў гэтым годзе філармонію нарэшце адкрыюць.

Сёлета ў вобласці будзе звернута сур'ёзная ўвага на якасць вады. Як вядома, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу вырашыць гэту праблему да 2025 года. У Гродзенскай вобласці каля 120 аграгарадкоў маюць патрэбу ў якаснай вадзе. Па словах губернатара, у 2018-м вобласць выдзеліць 1 млн рублёў на будаўніцтва 10 станцый абезжалезвання, а з 2019 года павінна запрацаваць рэспубліканская праграма «Чыстая вада». Гэта значыць, што справа па забеспячэнні якаснай вадой пойдзе хутчэй.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Эксклюзіў

# НАВАГОДНЯЯ НОЧ З МІЛІЦЫЯЙ

## Як наш карэспандэнт у Віцебску працаваў з 31 снежня на 1 студзеня разам з ахоўнікамі правапарадку

**На «дзяжурства» — разам з аператыўна-дзяжурнай службай УУС — заступіў у 23.30. А трэцяй гадзіне ўжо 2018 года разам з супрацоўнікамі ДАІ ахоўваў парадак на вуліцах абласнога цэнтра. Адразу можна прызнацца — сумна не было!**



### ДАПАМОГ... ДЗЕДУ МАРОЗУ!

Пішу гэтыя радкі а сёмай гадзіне раніцы. Дарэчы, падобным чынам сустрэў і 2017 год: навагоднюю ноч правёў, дзяжурачы з АМАПам. Сёлета вырашыў расказаць пра іншыя службы аховы нашых правоў на спакойнае жыццё. Такім чынам, складваецца «звяздоўская» традыцыя, нараджаецца новае журналісцкае хобі.

Вось і гэтым разам, калі амаль усе знаёмыя сядзелі за сталамі ва ўтульных кватэрах, чакаючы святочнага звароту кіраўніка дзяржавы, я накіроўваўся на праспект Фрунзэ. Там знаходзіцца будынак УУС Віцебскага аблвыканкама.

Да гэтага чатыры разы паглядзеў любімы ўсімі фільм «Іронія лёсу, або з лёгкай парай».



Па адным з кабельных каналаў яго зноў і зноў паўтаралі. Пакуль глядзеў кіно, з'еў салату «Алівье», але ні грама не выпіў спіртнога.

Па дарозе вырашыў зайсці да добрых людзей, каб уручыць ім сімвалічныя падарункі. І вось тут сустрэў Дзеда Мароза, якому спатрэбілася мая дапамога. Галоўны казачны персанаж стаяў каля дзвярэй пад'езда і не мог патрапіць унутр, дзе яго вельмі чакалі. Я націснуў «мае кнопкі», і адразу адбыўся звычайны цуд. Дзядуля радаваўся, як дзіця, быццам я Дзед Мароз, а не ён.

### І З ПРАСПЕКТА БУДАЎНІКОЎ

Дзверы будынка УУС былі зачынены. Але дзяжурнага папярэдзілі, што прыйдзе журналіст. Убачыўшы пасведчанне праз шкло, міліцыянер адразу адчыніў і выклікаў афіцэра, які павінен курыраваць маю работу.

**Старшы аператыўны дзяжурны УУС Віцебскага аблвыканкама, падпалкоўнік міліцыі Андрэй ШАСТОЎ** заўважыў, што раней журналісты ў навагоднюю ноч у цэнтры кіравання ўсімі сіламі міліцыі не прысутнічалі. Растлумачыў, што тут па тэлефоне 102 прымаюцца званкі з Віцебска. Адпаведныя падраздзяленні ёсць у Полацку, Наваполацку, Оршы. Жыхары глыбінкі, калі тэлефануюць у міліцыю, трапляюць у РАУС. Час прыезду міліцыі залежыць ад таго, наколькі сур'ёзная ў крымінагенным плане інфармацыя атрымана. У буйных населеных пунктах — у мінімальна кароткія тэрміны. Зразумела, каб дабрацца ў аддаленую вёску, спатрэбіцца больш часу. Але ў любым выпадку робіцца неабходная каардынацыя дзеянняў. Па выкліках выязджаюць прадстаўнікі розных міліцэйскіх служаў: патрульна-пастаявая, «Ахова», АМАП, ДАІ...

Тэлефоны не змаўкалі. Апошні званок у 2017 годзе раздаўся хвілін за шэсць да поўначы. Самага першага ў 2018-м прыйшлося чакаць нядоўга пасля 00.00.

Аператарам трэба мець вытрымку, разумець людзей, якія нярэдка, мякка кажучы, не зусім цвярозыя, або супакоіць абуранага чалавека і спытаць усю неабходную інфармацыю. А яшчэ трэба за хвіліны прымаць рашэнні. Таму аператарамі працуюць тыя, хто мае значны вопыт службы ў міліцыі...

Падчас майго знаходжання ў аператыўна-дзяжурнай службе жыхар сталіцы паведаміў, што адпачывае ў санаторыі недалёка ад Віцебска. Завяраў, што яго пабілі. Але хто, успомніць не можа.

Жанчына скардзілася, што дачку тэрарызуе яе малады чалавек: прысылае sms-паведамленні з пагрозамі. Яшчэ адна заявіла, што сын, які з ёй не жыве, ломіцца ў кватэру. Падобны званок з іншай шматпавярхоўкі: мужчына, які зараз знаходзіцца паміж сёмым і восьмым паверхамі, хацеў стаць няпрошаным госцем.

З праспекта Будаўнікоў дама патэлефанавала і сказала, што яе пабіў брат. Дарэчы, не мог не запытаць: ці былі калісьці паведамленні, якія нагадвалі б сюжэт фільма «Іронія лёсу...» У Віцебску няма 3-й вуліцы Будаўнікоў, але ёсць аднайменны праспект. Высветлілася, што аднойчы мужчына паведаміў, што ў яго кватэры незнаёмка. Аказваецца, не пазнаў жанчыну.

Сярод іншых былі паведамленні пра разбітае з-за крыўды шкло ў інтэрнаце. Але мяне больш уразіла інфармацыя пра высвятленне адносін паміж былым і цяперашнім мужчынамі адной жанчыны.

У памяшканні, дзе б'ецца пульс міліцыі Віцебска, вісіць шмат манітораў. На іх выявы, якія здымаюць вулічныя відэакамеры. Іх у горадзе сотні. Аператар лёгка можа павялічыць карцінку, павярнуць камеру.

Штодня прымаюць да 250 званкоў. Пацярпелыя таксама могуць прыйсці ў аддзяленне міліцыі, звярнуцца па дапамогу да патруля.

Навагодняя ноч адрознівалася, бадай, толькі часам актыўнасці. Штогод колькасць навагодніх зваротаў розная. У гэту ноч у міліцыю патэлефанавала амаль паўсотні грамадзян. Пераважная большасць зваротаў — вынік сварак паміж нецвярозымі сваякамі, суседзямі і знаёмымі.

У першыя гадзіны новага года стала вядома і аб пацярпелых ад піратэхнікі. Чатыры чалавекі з рознымі выбуховымі траўмамі звярнуліся па дапамогу да медыкаў. Мацней за ўсіх пацярпеў грамадзянін, у якога апёк твару і пашкоджанне вока. Гэта — вынік таго, што ў руках выбухнула петарда.

### «ДВА ДРЫНЬК ШАМПАНЬ»

Каля дзвюх гадзін ночы да УУС пад'ехала машына ДАІ. Пазнаёміліся. Маімі калегамі гэтым разам сталі: **старшы інспектар батальёна дарожна-патрульнай службы, маёр Барыс ЯГОЎДЗІК, інспектар дарожна-патрульнай службы, лейтэнант міліцыі Кірыл ІВАНОЎ.**

Для апошняга гэтая навагодняя ноч была першай на службе, бо Кірыл Іваноў нядаўна ў міліцыі. А маёр, яго настаўнік, на варце закона ўжо каля 12 гадоў. І восем разоў — на Новы год. Прыпомніў кур'ёзны навагодні выпадак — пра італьянца. Адбылося гэта некалькі гадоў таму. Іншаземец папаўся на тым, што нецвярозы кіраваў аўто з італьянскімі нумарамі. Затрымалі, калі толькі днець пачало. Але ж як дапытаць, не ведаючы італьянскай мовы? Прывезлі ва УУС. Супрацоўнік па-англійску задаваў пытанні. Але затрыманы гэтую мову дрэнна ведаў.

— Дык уявіце сабе, знайшлі мы перакладчыка, настаўніка. Ён, дарэчы, сціпла адзначыў свята: шмат не піў. Таму паставіўся да нашай просьбы з вялікай адказнасцю. Падчас гутаркі высветлілася, што італьянец прыехаў да знаёмых. Вырашылі яны дадаць спіртнога. Паказалі, дзе можна купіць, а тады на праспекце Будаўнікоў працавала начная крама. Напэўна, госць не зразумеў слова «пайсці» і паехаў. Падчас знаходжання ва УУС патрабаваў пасла... А наконт таго, што ён падшафэ, адказваў: «Два дрыньк шампань». Але медыкі былі іншага меркавання пра колькасць выпітага. З-за цяжкасцяў перакладу ўсе неабходныя паперы запоўнілі ажно а сёмай гадзіне вечара.

### ВЫПІЎ — І ЗА РУЛЬ

Тым часам па рацыі паведамілі, што на Маскоўскім праспекце вадзіцель ехаў па сустрэчнай паласе. Затрымалі парушальніка аператыўна: іншы экіпаж ДАІ прывёз яго ў наркалагічны пункт, каб вызначыць ступень ап'янення. Там жа складаюць пратаколы.

У затрыманага вызначылі больш за 0,5 праміле алкаголю. Гэта параўнальна няшмат, але ўсё роўна кіраваць аўто ў такім стане нельга. Ды і выглядаў ён на ўсе 1,5. Мужчына 1950 года нараджэння не адразу прызнаўся, што выпіў бутэльку віна. Яна — пустая — ляжала ў салоне яго аўто. Высветлілася, што прыехаў аж з Браслаўскага раёна да дачкі. Прывёз мяса і бульбы. Пры аглядзе «колаў» прадукты былі знойдзены. Супрацоўнікі ДАІ ўсе рэчы апісалі, каб потым гаспадар або яго сваякі маглі іх забраць. Машыну адагналі на штрафную стаянку. Нецвярозага, як і паабяцаў афіцэр, адвезлі да дачкі.

За такое парушэнне прадугледжаны штраф ад 50 да 100 базавых велічынь. Плюс пазбаўленне права кіраваць транспартам на тры гады. Бадай што невялікая цана за нечае захаванае жыццё на дарозе.

Вось так журналіст «Звязды» на свае вочы ўбачыў, чаго каштуе спакойная ноч у вялікім горадзе, калі ўся краіна святкуе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*



***P.S.*** *Рэдакцыя дзякуе* ***афіцыйнаму прадстаўніку УУС Віцебскага аблвыканкама, падпалкоўніку міліцыі Вользе ШКУРАТАВАЙ і начальніку аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, падпалкоўніку міліцыі Аляксандру КАЗЮЧЫЦУ*** *за дапамогу ў падрыхтоўцы рэпартажу*

■ Армія

# НАДЗЕЙНАЯ МОЦ

**Элітнае падраздзяленне Узброеных Сіл — 5-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння — святкуе 55-годдзе з дня ўтварэння.**

Вайсковая часць, якая з'яўляецца эпіцэнтрам беларускага спецназа, была створана акурат на свята — 1 студзеня 1963 года. Баявая падрыхтоўка ваеннаслужачых пачалася тут з першых дзён. Літаральна за некалькі месяцаў падраздзяленне было гатова да баявых дзеянняў у любых умовах абстаноўкі.

Высокае баявое майстэрства воіны-разведчыкі паказалі падчас падзей у Афганістане. За асабістую мужнасць больш як 700 чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а лейтэнанту Мікалаю Кузняцову прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Пасмяротна...

Сёння ваеннаслужачыя часці працягваюць традыцыі сваіх папярэднікаў, удасканальваюць палявую вывучку і баявое майстэрства. Не выпадкова сучасны стан і вынікі паўсядзённай дзейнасці вылучаюць часць як найбольш баяздольнае вайсковае фарміраванне Узброеных Сіл нашай краіны.



Фота Дзяніса МАЛЫШЫЦА.

— Галоўным мерапрыемствам года стала сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017», падчас якога асабовы склад годна выканаў пастаўленыя задачы, — адзначыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Навучальны год, які ўжо пачаўся, таксама будзе насычаны мерапрыемствамі баявой падрыхтоўкі. Упэўнены, што стабільнасць, мір і бяспека ў нашай краіне будуць надзейна абаронены і надалей. Для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае: моцная і стабільная ўлада, Узброеныя Сілы нашай дзяржавы, у тым ліку сілы спецыяльных аперацый, ядром якіх з'яўляецца праслаўленая воінская часць.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Факт

# Аляксандра і яшчэ 9 немаўлят

**Менавіта столькі дзетак паявілася ў Магілёве ў апошнія хвіліны 2017-га і першы дзень новага 2018 года.**

Маленькую Аляксандру прымалі ў Магілёўскай бальніцы № 1 пад бой курантаў — 31 снежня ў 23.55. Яе маці, Алена Панасовіч, прызналася, што, калі паведаміла па тэлефоне гэтую прыемную навіну мужу, ён не адразу змог паверыць у такое супадзенне. Прыдумваць імя дачцэ не прыйшлося, бацькі ўжо чакалі яе прыходу і загадзя вызначыліся. Дома Аляксандру чакае таксама старэйшы брат — 9-гадовы Арцём. Наогул святочная ночка ў «першай» бальніцы была напружаная. У 01.10 у рэанімацыі нарадзіўся першы ў гэтым годзе жыхар Магілёўшчыны — з Крычаўскага раёна — вагой усяго 2,02 кілаграма, ростам 45 сантыметраў. Потым у гэтым жа аддзяленні нарадзілася дзяўчынка. Плюс дзве прыгажуні з'явіліся на свет у звычайным аддзяленні. «Усе чацвёра адчуваюць сябе добра», — запэўнілі спецыялісты. Дарэчы, у бальніцы № 1 штомесячна на свет з'яўляюцца па 260—280 малых.

Яшчэ пяць нованароджаных — двух хлопчыкаў і трох дзяўчынак — прымалі ў двух радзільных аддзяленнях Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Узначаліла спіс дзяўчынка, якая нарадзілася ў 01.15.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Ёлачка, гары?

**Дзве ёлкі вышынёй па 15 метраў кожная дашчэнту згарэлі ў Гомелі. Агонь знішчыў іх пластыкавыя пакрыцці і ілюмінацыю па ўсёй плошчы.**

У навагоднюю ноч а другой гадзіне ратавальнікі выехалі на тушэнне штучнай ёлкі, усталяванай каля тралейбуснага парка. Другое ўзгаранне адбылося каля трох гадзін. Палала штучнае дрэва, устаноўленае насупраць абласной бібліятэкі на плошчы Перамогі. У абодвух выпадках ад навагодніх дрэў засталіся толькі аплаўленыя металічныя каркасы.

Узгаранне было тэрмінова ліквідавана. Людзі пры гэтым не пацярпелі. Цяпер вядзецца расследаванне і спецыялісты высвятляюць прычыны. У Гомельскім абласным упраўленні МНС паведамілі, што разглядаецца некалькі версій — ад няспраўнасці электраабсталявання да неасцярожнага абыходжання з піратэхнікай. Дарэчы, ёлкі, усталяваныя ў горадзе, былі правераны на адпаведнасць нормам электрабяспекі, забяспечана сістэма аховы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ПОДЗВІГІ БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

## Адразу тры ўзнагароды знайшлі сваіх герояў у Бабруйску

**Свайго бацьку Ніна Тоўсцік не памятае. Калі ён пайшоў на фронт, ёй было ўсяго некалькі месяцаў. Юрыю Худзякову ж пашчасціла пачуць пра Вялікую Айчынную з першых вуснаў. Ён і сёння ўспамінае, як гуляў з бацькавымі ўзнагародамі. З усімі, акрамя адной: франтавік пайшоў з жыцця, так і не даведаўшыся, што на яго парадным кіцелі не хапае медаля «За адвагу»...**



За бацькавым медалём Юрый ХУДЗЯКОЎ *(у цэнтры)* прыехаў разам са сваёй вялікай сям'ёй.

### ЯШЧЭ АДЗІН НАПАМІН

Найбольш ганаровай салдацкай узнагароды, якую ўручалі выключна за асабістую мужнасць, быў удастоены і чырвонаармеец Павел Петухоў. Летам 1943 года падчас аперацыі на Арлоўска-Курскім напрамку бацька Ніны Тоўсцік быў пешым сувязным: перадаваў загады камандавання, трымаў сувязь паміж падраздзяленнямі. Калі немцы пайшлі ў наступленне, узяў ручны кулямёт і стаў адстрэльвацца. Менавіта за гэты бой радавы 356-га стралковага палка 5-й стралковай дывізіі і атрымаў медаль «За адвагу». Пасмяротна...

— Пра тое, што дзядуля быў удастоены такой высокай салдацкай узнагароды, наша сям'я даведалася не так даўно, і ўсё дзякуючы інтэрнэту, — расказвае ўнучка героя Святлана. — Адпаведныя дакументы знайшлі ў абагульненым электронным банку даных «Мемарыял».

Не прайшло і некалькі месяцаў, як у ваенным камісарыяце Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў нашчадкі чырвонаармейца атрымалі пасведчанне аб узнагароджванні. Сам медаль уручаецца выключна яго кавалеру — такія правілы сённяшняга часу.

Дачка Паўла Петухова не хавае слёз — у іх сям'і з'явіўся яшчэ адзін напамін пра бацьку. Разам з пахавальнай і адзіным фотаздымкам ён зойме годнае месца. А вось куды дзеўся апошні бацькаў ліст, родныя ўдзельніка вайны нават уявіць не могуць.



Калі б не сучасныя тэхналогіі, нашчадкі чырвонаармейца Паўла ПЕТУХОВА наўрад ці даведаліся б пра яго подзвіг.

— Мне было 12—13 гадоў, як я яго чытала, — успамінае Ніна Тоўсцік. — Бацька пісаў незадоўга да гібелі. Я добра запомніла, што пісаліся гэтыя радкі ў лесе, на пні, акурат за дзень да таго самага, апошняга бою. Казаў, што калі застанецца жывы, то чакайце пісьма. Калі не дачакаемся, то значыць яго няма ў жывых. Неўзабаве прыйшла сумная вестка...

Вядома, што спачывае чырвонаармеец у агульнай магіле ў сяле Вяжа Арлоўскай вобласці, куды ў 1946 годзе былі перапахаваны. Цяпер там прыгожы мемарыяльны комплекс, дзе ўвекавечана імя кожнага, хто знайшоў апошні прытулак непадалёк ад гэтага месца.

### УЗНАГАРОДУ ЗНАЙШОЎ ПРАЎНУК

За бацькавым медалём Юрый Худзякоў прыехаў разам са сваёй вялікай сям'ёй.

— Узнагарода знайшла свайго героя больш як праз 70 гадоў пасля здзяйснення ім подзвігу, — удакладняе сын франтавіка. — Тое, што ён своечасова не атрымаў медаль «За адвагу», хутчэй за ўсё звязана з тым, што ў адным з баёў бацька быў цяжка паранены і восем месяцаў праляжаў у шпіталі.

Капітан запасу Панцеляймон Худзякоў так і дажываў свой век, не ведаючы, што, акрамя ордэнаў Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медаля «За перамогу над Германіяй», мае і найбольш ганаровую франтавую ўзнагароду. Відаць, так і засталося б гэта таямніцай, калі б не цікаўнасць праўнука ветэрана.

Арцём Жаўлакоў, які даўно захоплены ваеннай гісторыяй сваёй сям'і, адшукаў няўручаны медаль таксама на адным з сайтаў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Подзвіг народа». Вось скупыя радкі інтэрнэту, якія апісваюць подзвіг прадзеда: «Раніцай 12 сакавіка 1945 года быў атрыманы загад адправіць адзін узвод на левы фланг на адлегласці да аднаго кіламетра з задачай асядлаць дарогу, якая вядзе ў тыл немцаў. Пры выкананні задач капітан Худзякоў быў цяжка паранены...»

Гэта было не першае раненне Панцеляймона Худзякова. Прызваны на фронт у жніўні 1941 года, ён змагаўся з ворагам да самай Перамогі. Пасля вайны быў накіраваны ў Бабруйск памочнікам каменданта горада, а калі дэмабілізаваўся, да апошніх дзён патомны земляроб займаўся сельскай гаспадаркай.

### ГЕРОЙ МІРНАГА ЧАСУ

У той дзень у ваенкамаце Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў уручылі ўзнагароду і асабіста герою. Праўда, свой подзвіг былы афіцэр Анатоль Курнавенкаў здзейсніў ужо ў мірны час.

У далёкім 1963-м ён яшчэ быў выхаванцам Калінінскага суворaўскага ваеннага вучылішча. У той выхадны сонечны красавіцкі дзень недалёка ад набярэжнай Волгі ён гуляў са сваімі таварышамі ў футбол, як раптам пачуў крыкі аб дапамозе. Убачыўшы сярод крыг хлопчыка, які тоне, юны Толя, нават не задумаўшыся, скокнуў у лядзяную ваду. Моцная плынь несла пяцігадовага Жэню Міхайлава далей ад берага, але суворавец не здаваўся і ўсё-такі выцягнуў дзіця з вады. Праўда, хлопчык быў ужо без прытомнасці. Аказаўшы першую дапамогу, Анатоль не разгубіўся і даставіў дзіця ў санчасць вучылішча. Там жыццю Жэні больш нічога не пагражала. За праяўленую мужнасць суворaўцу аб'явілі падзяку і ўзнагародзілі памятным падарункам — наручным гадзіннікам у залачоным корпусе.

— Не баяліся, што і вас зацягне моцнай плынню? — цікаўлюся ў выратавальніка.

— Тады я пра гэта не думаў, — прызнаецца мой суразмоўца. Адзінае, аб чым ён шкадуе, што не абмяняўся з тым хлопчыкам кантактамі: хацеў бы даведацца, як склаўся яго лёс.

Гэта не адзіны выпадак, калі Анатолю Курнавенкаву даводзілася ратаваць чалавеку жыццё. Маёр у адстаўцы ўдзельнічаў у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Якой колькасці людзей ён падарыў шанц на жыццё, ужо і не ўспомніць. Праз шмат гадоў пасля атамнай катастрофы былому вайскоўцу ўручылі медаль «За выратаванне тых, што гінулі».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
*г. Бабруйск.*

# ЗЯМЛЯ НАРКЕВІЧА-ЁДКІ

## У беларусаў ёсць свой прафесар электраграфіі і магнетызму

**Шмат якім планетам дало чалавецтва імя сваіх слынных сыноў. Але ў гонар каго назвалі б людзі ўласную блакітную планету Зямля?**

Верагодна, гэта імя мы склалі б з мноства імёнаў тых, хто на працягу развіцця нашай цывілізацыі пакінуў прыкметны след у навуцы, мастацтве, адукацыі і асветніцтве... Можна доўга пералічваць прозвішчы зорак розных кірункаў дзейнасці, але ў сузор'ях сусветных славутасцяў заўжды застанецца імя нашага земляка Якуба Наркевіча-Ёдкі.



Метадыст Н. ОБУХАВА і доктар навук М. ПАКЛОНСКІ перадаюць у падарунак школе тамы Энцыклапедыі для школьнікаў і студэнтаў (на здымку справа — дырэктар школы Алена ІАРГАЧОВА).

### ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**Якуб Наркевіч-Ёдка нарадзіўся 8 студзеня 1848 года ў маёнтку Турын Ігуменскага павета (у наш час — Пухавіцкі раён Мінскай вобласці). Пасля вучобы ў Мінскай губернскай класічнай гімназіі займаўся на медыцынскім факультэце Парыжскага ўніверсітэта. Прымаў удзел у дзейнасці многіх навуковых таварыстваў, пасяджэннях Парыжскай акадэміі навук. Пашыраў медыцынскія веды ў найлепшых клініках Рыма і Фларэнцыі. Ва ўзросце 23 гадоў малады вучоны вярнуўся на радзіму, дзе пачаў актыўна займацца даследаваннямі ў галіне фізікі, метэаралогіі, медыцыны, псіхалогіі, сельскай гаспадаркі.**

У 80-х гадах XIX стагоддзя ў маёнтку Атонава Якуб Наркевіч-Ёдка стварае ўнікальную метэастанцыю, якая праз кароткі час становіцца адной з самых вялікіх на захадзе Расійскай імперыі. Ён вынаходзіць прыборы, у тым ліку ўнікальныя прыстасаванні для вызначэння хуткасці руху аблокаў, вільготнасці глебы на глыбіні да трох метраў. Шукае спосабы знізіць шкоду ад навальніцы і граду. Яго прыбор для рэгістрацыі навальнічнага разраду адчуваў атмасферную з'яву на адлегласці да 100 кіламетраў. Сенсацыйнымі сталі яго доследы ўплыву электрычнасці на рост раслін.

Пра такія цікавыя факты навуковай дзейнасці беларускага вучонага, вынаходніка, даследчыка можна было даведацца на канферэнцыі, прысвечанай яго 170-годдзю ў сценах Уздзенскай сярэдняй школы імя Кандрата Крапівы. Выбар месца, куды прыехалі ўдзельнікі канферэнцыі, не выпадковы: недалёка ад горада знаходзіўся маёнтак вядомага вучонага. Да сустрэчы з гасцямі школьныя краязнаўцы падрыхтавалі даклады, тут жа размясцілася выстаўка архіўных дакументальных фотаздымкаў, яшчэ адна экспазіцыя знаёміла з творамі жывапісу.

Пра навуковую спадчыну Наркевіча-Ёдкі паведаміў таксама **доктар медыцынскіх навук, прафесар Уладзімір РАСТОЎЦАЎ.** Сучасная медыцына ўлічвае даўнія доследы па выкарыстанні электрамагнітнага выпраменьвання газаразраднай плазмы для вызначэння фізіялагічнага стану арганізма.



Аднаўляецца старажытная сядзіба.

### ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

**У калекцыі прынца А. Ольдэнбургскага захоўвалася найбольшая колькасць электраграфічных здымкаў, зробленых Наркевічам-Ёдкам (напрыклад, электраразрад вакол рукі чалавека). Такія ўнікальныя здымкі ўпрыгожвалі залы музеяў многіх краін Еўропы, былі надрукаваныя ў тагачасных перыядычных выданнях XIX стагоддзя. Метад электраграфіі сёння выкарыстоўваюць медыкі, каб вызначыць дыягназ захворванняў.**




Ружы славутаму земляку.

Ішла размова на канферэнцыі і пра тое, як найбольш поўна перадаць нашчадкам гісторыка-культурную спадчыну сусветна вядомага земляка-навукоўца. Прэзентавалі аматарскія фільмы, расказвалі пра сумесную працу вучняў Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя з археолагамі НАН Беларусі на месцы былой сядзібы. Уразілі слухачоў выступленні вучняў Уздзенскай школы імя Кандрата Крапівы: адным з аб'ектаў іх краязнаўчых пошукаў стаў фотапартрэт Якуба Наркевіча-Ёдкі (школьнікі дэталёва разглядзелі ўзнагароды на мундзіры вучонага і ўдакладнілі іх назвы, статус). Своеасаблівую справаздачу перад аўдыторыяй трымаў **выдавец, краязнавец Аляксандр НІКІТКА.** Ён прадэманстраваў маляўнічыя календары з краявідамі Уздзеншчыны, падзяліўся планамі аднаўлення сядзібы славутага навукоўца. Прагучала ў зале і агульная прапанова ўдзельнікаў юбілейнай канферэнцыі: надаць імя Якуба Наркевіча-Ёдкі адной са школ райцэнтра.

### ГІСТАРЫЧНЫ ЖАРТ

**Вядомы рускі хімік Д. Мендзялееў меў сяброўскія стасункі з Я. Наркевічам-Ёдкам. Аднойчы ён заўважыў пра светла-шэры, які адліваўся срэбрам, дах маёнтка беларускага калегі.**

**— Відаць, пан Якуб вельмі заможны, калі здолеў пакрыць дах пасярэбраным матэрыялам?**

**— Не, — адказаў гаспадар, — гэта не срэбра, а наша беларуская асіна. Выдатны матэрыял для дахаў. Да таго ж з часам пад сонейкам становіцца бялёсым, падобным на срэбра. Рэкамендую!**

Перад заходам сонца ўдзельнікі канферэнцыі пераехалі з утульнай школьнай залы на поле блізь былога маёнтка Наркевіча-Ёдкі. Вершаліны сосен серабрыліся, нібы дах той сядзібы далёкага стагоддзя. Адсюль прайшлі да сямейных пахаванняў Наркевічаў-Ёдкаў, з павагаю паклалі кветкі на камяні з высечанымі імёнамі славутага роду. А потым зноў спыніліся каля белай брамы былога маёнтка. Думалася пра тое, што ў новым годзе аднаўленне старых пабудоў прадоўжыцца і, неўзабаве, як гэта планавалася, тут расчыняць дзверы адукацыйны цэнтр з фізічнай і метэалабараторыямі, інтэрактыўны музей навукі, выставачная зала. Сама сядзіба стане значна больш прыкметнай на карце турыстычных маршрутаў па гістарычных мясцінах Беларусі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.** *pyasecki@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Легенда спорту

# «ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ»

## Прызёр Алімпійскіх гульняў Сяргей НОВІКАЎ пра завяршэнне кар'еры, дзіцячы спорт і сучасны біятлон

**18 лютага 2010 года назаўжды застанецца ў гісторыі айчыннага біятлона: у індывідуальнай гонцы на Алімпіядзе ў Ванкуверы Сяргей Новікаў сенсацыйна выйграў «серабро», падзяліўшы другое месца не з кім-небудзь, а з самім каралём біятлона — Оле-Эйнарам Бьёрндаленам. Пасля яго поспехаў на Гульнях у нашай мужчынскай зборнай яшчэ не было. Сам Сяргей «адбегаў» яшчэ адзін алімпійскі цыкл, выступіў у Сочы-2014 і развітаўся з біятлонам, але не са спортам. Сёння Новікаў узначальвае спартыўны клуб Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Спартак», у яго падначаленні — 14 спартыўных школ — чатыры ў Бабруйску і дзесяць у Магілёве.**



— Набіраем, трэніруем і перадаём дзяцей у вышэйшае звяно па 20 відах спорту. На жаль, у прафсаюзных школах у Магілёве цяпер няма біятлона, ёсць толькі лыжныя гонкі.

***— Думалі, што пасля таго, як пакінеце вялікі спорт, будзеце працаваць з дзецьмі?***

— Не, але заўсёды хацеў застацца ў спорце і займацца карыснай справай. Лічу, што зараз у мяне гэта атрымліваецца. Будучы дзеючым спартсменам, не задумваешся аб дзіцячым спорце, пра тое колькі высілкаў прыкладаецца рознымі спецыялістамі для таго, каб вырасціць паўнавартаснага атлета. Гэта не толькі праца трэнера, але і бухгалтэрыя, усе арганізацыйныя пытанні, звязаныя з трэніровачным працэсам.

Калі параўноўваць цяперашні момант з тым часам, калі спортам пачынаў займацца я, вядома, шмат што змянілася. Цяпер набіраць дзяцей нашмат складаней, многія з фізічнымі адхіленнямі, іх не прапускае дыспансер. Ды і адарваць дзіця ад камп'ютара або планшэта не лёгка. У мой час усе ведалі, што на ўсе Чавусы, дзе я нарадзіўся, ёсць адно аддзяленне біятлона, і ўсе стараліся трапіць туды.

Цяпер, наогул, па асобных відах спорту цяжка набраць дзяцей, напрыклад, акадэмічнае веславанне: зразумела, што база знаходзіцца не ў цэнтры горада. Або лыжныя гонкі — спартыўная школа таксама на ўскраіне, не ўсе бацькі захочуць вазіць туды, а дзіця само ездзіць праз увесь горад. А самыя папулярныя сёння, па маіх назіраннях, — усе віды адзінаборстваў, бокс і футбол, вядома.

***— Многія цяпер кажуць аб праблемах з дзіцячымі трэнерамі...***

— Яна ёсць. У нас шмат узроставых спецыялістаў, а маладых складана прыцягнуць і ўтрымаць у школах, ды каб яны яшчэ і добрасумленна працавалі. Зразумела, што маладым хочацца ўсяго і адразу. Аднак у каго да гэтай справы прызванне, гарачы вочы, той застаецца, так было заўсёды.

***— Прайшло практычна чатыры гады з таго часу, калі вы скончылі выступаць. Хутка прывыклі да новага жыцця?***

— Зразумела, што прабегаўшы палову жыцця, ты ўжо як робат — падымаешся на зарадку, сняданак, ведаеш, што потым у цябе будзе трэніроўка, абед, адпачынак, другая трэніроўка. Гэта фарміруе пэўныя звычкі. Цяпер ужо выйшаў на звычайны жыццёвы рытм, вядома, былі складанасці з адаптацыяй. Але ведаеце, усяму свой час, галоўнае — галавой да гэтага дайсці і зразумець, што час актыўнага спорту прайшоў.

***— Вы калі гэта зразумелі?***

— Пасля Алімпійскіх гульняў у Сочы, бачыў, што вынікі ўпалі, яны не задавальнялі ні мяне, ні іншых. Таму разумеў, што прыйшоў час перабудоўвацца, шукаць работу і ісці далей. Страхаў, што не знайду сябе ў жыцці, не было. Перад Алімпіядай, калі ведаеш, што заўтра на старт — вось гэта страшна, і перажыванне, і мандраж. А тут... чалавек да ўсяго прывыкае. Рукі, ногі ёсць — працы не баюся.

Сёння гляджу біятлонныя трансляцыі і думаю, на шчасце, ужо не трэба так цяжка трэніравацца. Цяпер іншыя складанасці ў жыцці.

***— Але ўсё ж успамінаеце сваю кар'еру?***

